Станаўленне і развіццё інстытута мясцовай лесаахоўнай адміністрацыі на тэрыторыі Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.)

МЯСЦОВЫЯ ОРГАНЫ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ, КАЗЁННЫЯ ПАЛАТЫ, ПАЛАТЫ ДЗЯРЖАЎНЫХ МАЁМАСЦЕЙ, УПРАЎЛЕННІ ДЗЯРЖАЎНЫХ МАЁМАСЦЕЙ, ЛЕСААХОЎНЫЯ КАМІТЭТЫ, ЛЯСНАЯ ВАРТА

Станаўленне і развіццё інстытута мясцовай лесаахоўнай адміністрацыі на тэрыторыі Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) [Тэкст]: Справаздача аб НДР (заключ.): / БДПУ; кіраўн. Пугач І.В. - Мн., 2019. - 52 с., 1 дадатак - Бібліягр.: С. 42-50 (106 назв.). - № ДР 20190803.

**Аб’ект даследавання** – палітыка расійскага ўрада ў галіне арганізацыі і развіцця мясцовай дзяржаўнай лесаахоўнай адміністрацыі на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст.

**Мэта работы** – выяўленне сутнасці і асаблівасцей дзейнасці мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па ахове лясоў Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст.

**Метады даследавання**: аналіз, сінтэз, дэдукцыя, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны, гісторыка-генетычны, картаграфічны, статыстычны фармальна-юрыдычны, параўнальна-прававы метады.

**Вынікі** - на падставе даных, атрыманых у ходзе правядзення даследавання, была распрацавана тэарэтычная мадэль, якая характарызуе асноўныя ўласцівасці працэсу станаўлення і развіцця інстытута мясцовай дзяржаўнай лесаахоўнай адміністрацыі на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст.

**Ступень укаранення** - па выніках праведзенага даследавання апублікаваны 3 артыкулы, 1 з якіх – у часопісе, які ўключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў. У друк прадстаўлены 3 работы, 1 з якіх – у часопіс з Пераліку навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў. Атрыманыя вынікі былі ўкаранёны ў адукацыйны працэс гістарычнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» і лесагаспадарчага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт».

**Вобласць выкарыстання** - вынікі могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы спецыяльных курсаў па гісторыі Беларусі, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па іх, напісанні абагульняючых прац па гісторыі Беларусі і Расіі, а таксама могуць быць запатрабаваны органамі дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь пры ажыццяўленні ўдасканалення сістэмы зберажэння і аховы лясоў.